Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

2 ЧЭРВЕНЯ 2017 г. ПЯТНІЦА №103 (28467)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

XVII НАЦЫЯНАЛЬНЫ ФЕСТЫВАЛЬ БЕЛАРУСКАЙ ПЕСНІ І ПАЭЗІІ
Мала93ечна-2017

## СВЯТА ДУХОЎНАЙ СПАДЧЫНЫ

*Удзельнікам XVII Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі*

***Паважаныя сябры!***

*Сардэчна віншую вас з адкрыццём XVII Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі.*

*За гады існавання фестываль стаў яскравай падзеяй у культурным жыцці рэспублікі. Традыцыйна ён садзейнічае ўзбагачэнню духоўнай спадчыны нашых продкаў, папулярызацыі роднага паэтычнага слова, захаванню найлепшых дасягненняў музычнага мастацтва краіны.*

*Праграма сёлетняга свята, прысвечаная 135-годдзю з дня нараджэння вялікіх песняроў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа, надае запланаваным мерапрыемствам асабліва высокае гучанне.*

*Упэўнены, што гэты творчы форум зноў адкрые цікавыя праекты і новыя імёны, паспрыяе прафесійнаму росту маладых талентаў.*

*Жадаю ўсім удзельнікам фестывалю натхнення, а яго гасцям — прыемных уражанняў і цёплых сустрэч!*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Вячаслаў ШЫЛА, намеснік міністра аховы здароўя:**

*«Колькасць замежных грамадзян, якія атрымалі медыцынскія паслугі ў Беларусі, з 2010-га да 2016 года вырасла ў 1,5 раза. Напрыклад, экспарт медыцынскіх паслуг праз усе каналы рэалізацыі ў 2016 годзе па Вялікабрытаніі вырас у 3,4 раза, па Аўстраліі — у 8,7 раза, ЗША — амаль у 3 разы... У першым квартале 2017 года медыцынскія паслугі ў Беларусі атрымалі прадстаўнікі 98 краін. У нас павялічыўся ў 2 разы экспарт у Літву, Грузію, Польшчу, актыўна расце экспарт у Аўстралію. Сярод пацыентаў, якія атрымалі медыцынскую дапамогу ў нас, адзначаны грамадзяне 128 краін свету. У арганізацыях сістэмы Міністэрства аховы здароўя за 2016 год медыцынскія паслугі атрымалі больш за 150 тысяч замежных грамадзян».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 02.06.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8635 | ▼ |
| Еўра | 2,0924 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0329 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0709 | ■ |

ISSN 1990 - 763X

# Рыбацкі стаж бабулі Надзеі



На Браслаўскіх азёрах, а менавіта ў вёсцы Слабодка, можна сустрэць незвычайнага рыбака — Надзею ГУДЗЕЛЬ. Ад летняй сядзібы Надзеі Фядосаўны возера — праз дарогу, і ў кожную вольную хвіліну васьмідзесяціпяцігадовая жанчына ідзе на рыбацкі масток.

Фота Анатолія КЛЕШЧУКА.

■ Нясумнае лета

## ДА ЗАЕЗДУ ГАТОВЫ!

### Як дзіцячыя лагеры рыхтуюцца да сезона?

**Тры кашулі, пяць пар шкарпэтак і ўбор для дыскатэкі. Вось далёка не поўны спіс таго, што дзіцяці абавязкова трэба ўзяць з сабой у лагер. Больш за 350 тысяч школьнікаў адпачнуць гэтым летам у аздараўленчых лагерах. Як там рыхтуюцца да заезду? Мы наведаліся ў лагер «Гарызонт», дзе ўжо ў панядзелак чакаюць першую змену.**

СТАР. 4




■ Спецыяльны рэпартаж

## На танку Перамогі — нашчадак пераможцы

Карэспандэнты «Звязды» на свае вочы ўбачылі, як рыхтуюцца да ваеннага парада, што адбудзецца ў Мінску на Дзень Незалежнасці



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**На аэрадроме «Ліпкі» рэпеціруюць толькі баявыя машыны. Знешне яны яшчэ не «ў форме»: тэхніку пафарбуюць напярэдадні свята. Ва ўсім астатнім — што датычыцца зладжанасці парадных разлікаў, вытрымлівання дыстанцыі і хуткасці руху, а таксама выраўноўвання ў адну лінію — «жалезныя коні», а таксама іх «вершнікі» гатовы да галоўнай урачыстасці года. Засталіся толькі штрыхі...**

Па традыцыі адкрые механізаваную калону танк Перамогі — легендарны Т-34-85, які 3 ліпеня 1944 года пад камандаваннем гвардыі малодшага лейтэнанта Дзмітрыя Фролікава першым уварваўся ў беларускую сталіцу.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# ЧАМУ ПАДКАЧАЛА НАФТА?

## У Палацы Незалежнасці абмеркавалі стратэгію развіцця айчыннай нафтаперапрацоўкі

**Няхай уласных запасаў нафты наша дзяржава мае не так шмат, айчынная нафтаперапрацоўка развіта добра. Мадэрнізацыя ж адпаведных заводаў павінна была павялічыць даходы ад сферы. Але гэтага не толькі не адбылося, а, наадварот, паступленні ад названай галіны ў дзяржаўную казну пачалі зніжацца. Натуральна, ёсць аб'ектыўная прычына: падзенне сусветных цэн на «чорнае золата», тут мы мала што можам зрабіць. У той жа час існуюць і суб'ектыўныя фактары. На іх кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка засяродзіў увагу падчас учарашняй нарады, прысвечанай стратэгіі развіцця беларускай нафтаперапрацоўкі.**

— Няма неабходнасці яшчэ раз казаць пра важнасць гэтага пытання, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Я ўжо некалі казаў пра тое, што гэтае пытанне падобнае да незалежнасці нашай дзяржавы. Мы павінны зрабіць усё, каб гарантаваць энергетычную незалежнасць і бяспеку Беларусі. Гэта стратэгічная галіна краіны, доля якой у прамысловасці складае больш за 13%, а ў экспарце і таго болей — 17%. Тым не менш унёсак у беларускую эканоміку, на жаль, зніжаецца. Дабаўленая вартасць нафтаперапрацоўкі ў валавы ўнутраны прадукт у 2016 годзе, калі дакладна палічыць, складае ўсяго паўпрацэнта.

Прэзідэнт параўнаў: унёсак двух нафтаперапрацоўчых заводаў, напрыклад, супастаўляльны з такой кампаніяй, як «Белтэлекам».

У мінулым годзе з'явілася негатыўная тэндэнцыя ў знешнім гандлі нафтай і нафтапрадуктамі. Сальда па выніках бягучага года аказваецца як адмоўнае. Такая сітуацыя выклікае сур'ёзную асцярогу ўлады: нафтаперапрацоўка з флагмана эканомікі ператвараецца ў стратную галіну, якую неабходна мадэрнізаваць.

— Ва ўдасканаленне НПЗ укладзены немалыя грошы, а патрэбнай аддачы дагэтуль няма, — нагадаў кіраўнік дзяржавы. — На запланаванную ў 2015 годзе глыбіню перапрацоўкі нафты — а абяцана было больш за 90% — выйсці на сённяшні дзень так і не атрымалася.

У чым жа праблема?

— Бясспрэчна, аб'ектыўна сказаўся ўплыў сусветнай кан'юнктуры на зніжэнне эфектыўнасці працы, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Цэны ўпалі ў нафту ў два з паловай разы, а то і болей. Аднак негатыўную ролю сыгралі і пралікі па вызначэнні стратэгіі развіцця галіны. І вось галоўнае пытанне: у чым гэтыя пралікі? Таксама адсутнасць выразнай праграмы дзеянняў урада па гэтым пытанні. Другое пытанне: чаму?

Па словах Прэзідэнта, некампетэнтная падрыхтоўка праектаў, няправільнае размеркаванне сіл і сродкаў прывялі да павелічэння кошту і тэрмінаў будаўніцтва: па асобных праектах ажно да пяці гадоў.

— Выклікае сумненні, што ў дэкларавaным — як мы мяркуем — 2019 годзе мы канчаткова завяршым мадэрнізацыю нафтаперапрацоўчых заводаў, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Нашы прадпрыемствы аказаліся не гатовы працаваць у новых умовах сусветных цэн на нафту, хоць і павінны былі дзейнічаць на апярэджанне. А цяпер «Нафтан» ледзь зводзіць канцы з канцамі і пастаянна выпрошвае дапамогу ў дзяржавы.

Падчас нарады Прэзідэнт агучыў шэраг пытанняў, на якія ён хацеў атрымаць адказ. Па-першае, якая сёння эканамічная сітуацыя на нафтаперапрацоўчых прадпрыемствах? Што чакаецца па выніках года? Па-другое, якой бачыць урад стратэгію развіцця ўсіх галін у новых рынкавых умовах на перспектыву — доўгатэрміновую і сярэднетэрміновую? Па-трэцяе, колькі часу і грошай спатрэбіцца для завяршэння мадэрнізацыі прадпрыемстваў і павышэння эфектыўнасці галіны? Якія крыніцы фінансавання запланаваны?

— Майце на ўвазе, на першым месцы павінна быць эканоміка нафтаперапрацоўкі, рэзультатыўнасць яе працы, — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка. — Пры ўзгадненні назначэння новых дырэктараў «Нафтана» і Мазырскага НПЗ ім ставіліся дакладныя задачы па выпрацоўцы праграм дзеянняў у рэальнай сітуацыі, таму заслухаем і іх даклады. Часу дастаткова для таго, каб высветліць сутнасць справы. Я іх папярэджваў пра тое, што стаць у старую каляіну і каціць па накатанай, а я гэта бачу з вашых прапаноў на сённяшні дзень, не атрымаецца.

Кіраўнік дзяржавы звярнуўся і да тэмы мадэрнізацыі ўвогуле, не толькі датычна нафтаперапрацоўкі:

— Яшчэ раз хачу падкрэсліць: у нас многія праекты мадэрнізацыі прадпрыемстваў праваленыя. Я ўжо прэм'еру і кіраўніку Адміністрацыі Прэзідэнта казаў, каб у найбліжэйшы час гэтыя праекты былі прааналізаваны і мне было дакладна. Гэтым займецца Косінец, яму даручаны гэтыя праекты: сабраць спецыялістаў па ўсіх кірунках... Усё гэта павінна быць аб'ектыўна прааналізавана і пакладзена мне на стол. Цярпець такі стан з мадэрнізацыяй, якую мы планавалі завяршыць у пэўныя тэрміны, я не збіраюся... Не дазволю, каб рашэнні Прэзідэнта былі дэвальваваны, дэзавуіраваны і нявыканаваны, гэтага быць не можа.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*



**У тэму:**

**Ігар ЛЯШЭНКА, старшыня канцэрна «Белнафтахім»:**

— На нарадзе ў Прэзідэнта мы разглядалі два блокі пытанняў. Першы датычыўся эфектыўнасці працы галіны ў цэлым. Другая частка была прысвечана інвестыцыйным праектам нашага нафтахімічнага комплексу. Самая галоўная цяжкасць сённяшняй сітуацыі на рынках у тым, што яны перагружаны пастаўкамі як нафты, так і нафтапрадуктаў. Усё гэта вядзе да зніжэння маржынальнасці. У гэтых няпростых умовах нашым НПЗ прыходзіцца адшукваць сродкі на рэалізацыю інвестыцыйных праектаў. Праекты плануецца завяршыць у 2019 годзе. Патрабуюцца значныя сумы: па адным заводзе больш за 500 мільёнаў долараў, па другім — больш за 700 мільёнаў долараў.

■ Блізкая ўлада

# Чыноўнік павінен працаваць для людзей

**Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці Сяргей РАЎНЕЙКА выслухаў праблемы жыхароў Воранаўскага раёна падчас выязднога прыему грамадзян.**

За некалькі гадзін Сяргей Раўнейка прыняў восем чалавек з розных населеных пунктаў. Некаторыя праблемы вырашаліся на месцы, як, напрыклад, аднаўленне на працы даяркі аднаго з сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Жанчына не паведаміла своечасова аб тым, што знаходзіцца на бюлетэні, і гаспадарка не працягнула з ёй дагавор. Цяпер былая работніца хоча вярнуцца, але яе месца занята. Сяргей Раўнейка прапанаваў юрысту сельгаспрадпрыемства даць жанчыне яшчэ адзін шанц. Але ўжо на тых умовах, якія прадставіць наймальнік. Пры гэтым ён папярэдзіў, што парушэнне дысцыпліны недапушчальнае.

Яшчэ адна праблема нарэшце зрушылася з месца. Справа датычыцца будаўніцтва дарогі па вуліцы Школьнай у вёсцы Бенякoні. Жыхары, якія прыйшлі на прыём, абураліся бездарожжам, з якім яны змагаюцца некалькі гадоў, але атрымлівалі адпіскі з розных інстанцый. Каб не зацягваць вырашэнне гэтай праблемы і ўпарадкаваць 180 метраў дарогі, прынята сумеснае з уладамі рашэнне пачаць работы да 1 ліпеня.



Фота БЕЛТА.

Доўгі час цягнецца канфлікт паміж сельгаспрадпрыемствам і жыхаркай вёскі Валейшы, у якой забралі 146 галоў буйной рагатай жывёлы. Гісторыя нагадвае сапраўдны трылер. Цяжка ўявіць, як жанчына з сынам маглі ўтрымліваць такі статак. На самай справе нагляду за ім не было, каровы пасліся на калгасных палетках, былі амаль што дзікімі. У рэшце рэшт статак з дапамогай паляўнічых вылавілі. Жанчына патрабуе выплаціць ёй значную суму, але ў калгасе падлічылі страты, звязаныя з пашкоджанымі палеткамі і платай паляўнічым. Астатнія грошы гаспадарка гатова вярнуць. Спрэчнае пытанне разгледзіць суд.

— Людзі прыходзяць на прыём — і гэта ўжо паўсправы, — падкрэсліў інспектар па Гродзенскай вобласці, — яны выкажуць сваю просьбу і разам з тым пераканаюцца, што іх зварот у чымсьці слушны, у чымсьці — не. На гэты вынік таксама трэба працаваць.

Некаторыя жыхары трапілі на прыём, прайшоўшы не адзін судовы разбор. Былы настаўнік з вёскі Гіркі займаецца прыватызацыяй кватэры ў блакіраваным доме (такія дамы маюць некалькі кватэр, уваходы ў кожную з якіх арганізаваны з прыдамавой тэрыторыі). Для прыватызацыі такіх памяшканняў патрэбен пісьмовы дазвол усіх уласнікаў. Але суседзі не могуць дагаварыцца паміж сабой. Сітуацыя між тым становіцца ўсё больш складанай. Каб знайсці з яе выхад, неабходна пайсці на дыялог, знайсці кампраміс. У адваротным выпадку прыйдзецца звяртацца ў суд. Заяўнік, як высветлілася, не раз ужо сутыкаўся з гэтай інстанцыяй. Мае ён і багаты вопыт па зваротах да ўлад, у прыватнасці ў службы аховы прыроды і падатковыя. Сабраў цэлы том перапіскі, які мае намер перадаць у Гродзенскі аблвыканкам.

— Чыноўнік любога ўзроўню павінен добрасумленна выконваць свае абавязкі, бо кожны чалавек лічыць, што яго праблема такая ж важная, як і праблемы дзяржаўнага маштабу. І гэта правільна. Вядома ж, пры належным выкананні сваіх паўнамоцтваў на ўсіх узроўнях улады колькасць зваротаў, безумоўна, знізілася б, — зазначыў Сяргей Раўнейка.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

# У міжнародным рэжыме

**Спікер верхняй палаты правёў сустрэчу з заканадаўцамі Тайланда.**

Ключавой тэмай сустрэчы стала эканамічнае супрацоўніцтва. Міхаіл Мясніковіч, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, адзначыў, што, нягледзячы на кантакты, якія досыць актыўна развіваюцца, у нас няма базавых пагадненняў: аб узаемным заахвочванні і абароне інвестыцый, аб гандлёва-эканамічным, а таксама навукова-тэхнічным супрацоўніцтве. Таксама беларускі спікер агучыў просьбу лібералізаваць гандлёвыя рэжымы, паколькі тарыфная палітыка Тайланда абцяжарвае ўваходжанне беларускіх тавараў на тайскі рынак. Акрамя таго, неабходна актывізаваць рэгіянальнае супрацоўніцтва, бо «са сталіц не заўжды можна вырашыць тыя пытанні, якія прадстаўляюць рэгіянальны інтарэс».

* * *

**Пэўныя вынікі правядзення пасяджэння Парламенцкага камітэта Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы падвёў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.**

На сустрэчы з кіраўніком Прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Беларусі Андрэа Вікторын ён падкрэсліў, што «Беларусь становіцца інтэграцыйнай пляцоўкай, дзе можна разглядаць пытанні еўрапейскага парадку дня».

У пасяджэнні Парламенцкага камітэта ЦЕІ, якое адбылося днямі ў Мінску, удзельнічалі прадстаўнікі 12 дзяржаў. Гэта пэўны рэкорд. Раней на падобных сустрэчах прысутнічалі прадстаўнікі максімум дзевяці краін.

* * *

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Чэшскай Рэспублікі ў Беларусі Міланам ЭКЕРТАМ.**

Абодва бакі выказалі жаданне больш актыўна развіваць міжпарламенцкае супрацоўніцтва. «Мы разглядаем Чэхію як надзейнага, перспектыўнага партнёра па ўсіх напрамках супрацоўніцтва», — падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка. Чэшскія дэпутаты таксама выступалі суаўтарамі рэзалюцыі, падрыхтаванай Беларуссю на летнюю сесію Парламенцкай асамблеі АБСЕ, якая накіравана на выпрацоўку мер па барацьбе з новымі псіхаактыўнымі рэчывамі. «Зробім усё, каб яна (рэзалюцыя. — **«Зв.»**) была прынятая, таму што гэта датычыцца практычна ўсіх краін», — падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*
**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Прэзідэнт Сербіі прыняў прысягу і афіцыйна ўступіў на пасаду



Аляксандр Вучыч прынёс прысягу перад Народнай скупшчынай (парламентам) Сербіі. Прамоўлены тэкст прэзідэнцкай клятвы, ён афіцыйна ўступіў у пасаду на пяцігадовы тэрмін. Прэзідэнт упершыню ў сербскай гісторыі прынёс прысягу на найстаражытнейшым помніку сербскай кірылічнай пісьменнасці — Міраслававым Евангеллі XII стагоддзя. Ён вымавіў клятву, паклаўшы руку на Канстытуцыю краіны, якая, у сваю чаргу, ляжала на дакладнай копіі старажытнага фаліянта.

## Улады Рыма расселяць усе цыганскія лагеры

Зацверджана новая праграма па рассяленні цыганскіх лагераў у межах горада, сродкі на яе паступяць з еўрапейскіх фондаў. «Зараз мы можам вельмі выразна заявіць аб тым, што праблема цыганскіх лагераў у Рыме будзе вырашана», — заявіла на прэзентацыі праекта мэр Рыма Вірджынія Раджы. Паводле дамоўленасці, дасягнутай паміж лідарамі цыганскіх кланаў і кіраўніцтвам італьянскай сталіцы, першымі будуць закрыты два буйныя паселішчы на паўднёва-ўсходзе і паўночным захадзе ўскраінах горада.

## НАСА адправіць зонд да Сонца

Амерыканскае касмічнае агенцтва (НАСА) абвясціла аб праграме запуску спецыяльнага зонда для даследавання сонечнай кароны. Мэта місіі Solar Probe Plus — збор даных аб актыўнасці свяціла, якія дапамогуць прадказваць сонечныя ўспышкі і магнітныя буры, што ўзнікаюць на Зямлі. Зонд падляціць да Сонца на адлегласць у 7 млн км, расказвае вядучы спецыяліст НАСА па праекце Solar Probe Plus Нікола Фокс. Паблізу свяціла апарат сутыкнецца з тэмпературамі вышэйшымі за 1370 °C, яму давядзецца працаваць ва ўмовах наймацнейшай радыяцыі і пад ударамі дробных звышгукавых часціц. Дарэчы, місія стартуе ў жніўні 2018 года.

# Нумары для абітурыентаў

**Гарачая лінія па пытаннях уступнай кампаніі адкрываецца ў Міністэрстве адукацыі. Яна будзе працаваць па 18 жніўня ўключна.**

Спецыялісты, якія будуць дзяжурыць на гарачай лініі, акажуць дапамогу абітурыентам і іх бацькам у атрыманні інфармацыі, якая датычыцца паступлення ў вышэйшыя і сярэдняя спецыяльныя навучальныя ўстановы. Тэлефанаваць можна па нумары **8 017 222 43 12** у працоўныя і дадатковыя дні — з 9.00 да 18.00, перапынак на абед — з 13.00 да 14.00.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Погляд



# МЕСЦА БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЭПЦЫІ 4.0

**Першы нямецка-беларускі форум «Чацвёртая прамысловая рэвалюцыя (Industrie 4.0): лічбавая трансфармацыя эканомікі», які днямі прайшоў у Мінску, можна без перабольшання назваць значнай падзеяй для сталіцы. XXI стагоддзе няўхільна павышае патрабаванні да навукова-тэхнічнага суправаджэння вытворчага працэсу, і ўсе нюансы трансфармацыі ў гэтай сферы, якая адбываецца ў свеце, трэба добра ведаць, каб эфектыўна ўкараняць у беларускую эканоміку.**

Як адзначыў на адкрыцці канферэнцыі **кіраўнік прадстаўніцтва нямецкай эканомікі ў Рэспубліцы Беларусь Уладзімір АЎГУСЦІНСКІ,** важнасць падобнага мерапрыемства заключаецца і ў тым, што ў Беларусі не цалкам рэалізавана яшчэ і прамысловая рэвалюцыя трэцяга ўзроўню. Нагадаю, што, на думку швейцарскага эканаміста Клауса Марціна Шваба, у цэнтры трэцяй рэвалюцыі знаходзілася электроніка і інфармацыйныя тэхналогіі, якія аўтаматызавалі вытворчасць. А сутнасцю чацвёртай прамысловай рэвалюцыі называюць масавае ўкараненне інавацый, якія базуюцца на камбінацыях тэхналогій. У выніку фізічны, лічбавы і біялагічны сусветы ўсё больш зближаюцца.

У сваім прывітальным слове **пасол Германіі Петэр ДЭТМАР** адзначыў, што канцэпт Industrie 4.0 распрацаваны ў Германіі ў цесным супрацоўніцтве ўрада і бізнесменаў, якія аднолькава зацікаўлены ў дыгіталізацыі прамысловасці. У цяперашні момант Кітай, Японія, ЗША, Паўднёвая Карэя і Францыя таксама вядуць распрацоўкі падобных канцэпцый. Германія зацікаўленая ў рэалізацыі сваёй канцэпцыі, паколькі з'яўляецца эканомікай з высокай доляй прамысловасці. Мэта Industrie 4.0 — стварэнне самаарганізаванай прамысловай вытворчасці, дзе чалавек, тэхналогіі і прамысловыя вырабы ўзаемадзейнічаюць паміж сабой. У доўгатэрміновай перспектыве гаворка ідзе пра трансфармацыю ўсяго грамадства.

**Намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Баляслаў ПІРШТУК** выказаў зацікаўленасць Беларусі ў тым, каб найлепшая эканоміка Еўропы прадэманстравала нам свае магчымасці. У нас ужо шмат добрых прыкладаў супрацоўніцтва з Германіяй. Гэта важна для Беларусі як для адкрытай эканомікі.

**Супрацоўніца Федэральнага міністэрства эканомікі і энергетыкі ФРГ Анжэлік ВАЙКУМ-ГРОС** адзначыла, што ўсе, хто не будзе прымяняць Industrie 4.0 на практыцы, не маюць будучыні. Гэта новая канцэпцыя грунтуецца на адкрытых стандартах для лічбавага свету — у выніку іх укаранення абсталяванне ад розных вытворцаў зможа ўзаемадзейнічаць. Дасягаць гэту мэту важна ўзгоднена. Дыгіталізацыя эканомікі можа стаць важнай тэмай і ў рамках беларуска-германскай камісіі.

**Дзмітрый КОРЧЫК, намеснік міністра прамысловасці Рэспублікі Беларусь,** заўважыў, што Беларусь цесна звязана з развіццём прамысловага комплексу ў Германіі і павінна інтэгравацца з ім. Ужо ёсць вялікі вопыт супрацоўніцтва, у прыватнасці БМЗ рэалізаваў сумесны праект трубнай вытворчасці на чвэрць мільярда долараў. Сёння Беларусь занятая мадэрнізацыяй падыходаў па прамысловай палітыцы. І нямецкі вопыт укаранення Industrie 4.0 для нас вельмі важны.

**Сяргей НАБЕШКА, намеснік старшыні Беларускай гандлёва-прамысловай палаты,** пагадзіўся, што хуткасць з'яўлення новых тэхналогій проста неймаверная. Нам трэба разумець, як інтэгравацца ў сучасную глабальную эканоміку. Калі кажуць пра платформу 4.0 — гэта злом уяўленняў аб бізнесе і прыбытку. Гэта немінучае заўтра.

**Сяргей ВАЙЦЯХОЎСКІ, намеснік генеральнага дырэктара Кампаніі па развіцці індустрыяльнага парка «Вялікі камень»,** заявіў, што ўкараненне Industrie 4.0 цягне за сабой зніжэнне выдаткаў і павышэнне канкурэнтаздольнасці. Парк «Вялікі камень» нацэлены на ўдзел у гэтым працэсе. У прыватнасці, неўзабаве чакаецца прыход нямецкай кампаніі Дзіфенбахер, якая павінна ўкласці больш за 200 мільёнаў еўра ў вытворчасць кампазітных матэрыялаў.

Аналізуючы выступленні ўдзельнікаў, можна выказаць здагадку, што з прычыны памеру эканомікі ўдзел нашай краіны ў чацвёртай прамысловай рэвалюцыі не патрабуе стварэння яе ўласнай канцэпцыі. Можна далучыцца да адной са створаных у блізка размешчаных да Беларусі эканоміках. І нямецкая Industrie 4.0 выглядае магчымым варыянтам, бо ўжо наладжана цеснае супрацоўніцтва беларускай эканомікі з Германіяй.

Асабліваасцю чацвёртай прамысловай рэвалюцыі стане адыход ад канвеернай зборкі прадукцыі і шырокае ўкараненне робатаў, аб'яднаных у адзіную сістэму пры дапамозе сэнсараў. Робаты здольныя працаваць 24 гадзіны ў суткі, што патанніць вытворчасць. З'явіцца магчымасць аператыўна і танна вырабляць невялікія партыі прадукцыі па канкрэтным заказе або для невялікага рынку.

Мінусам стане адсутнасць неабходнасці ў вялікай колькасці рабочых на сучаснай вытворчасці. Часы прамысловых гігантаў з калектывамі ў 15—20 тысяч рабочых няўхільна адыходзяць у мінулае. Рабочым з простымі спецыяльнасцямі будзе ўсё цяжэй знайсці працу па профілі. Усё больш будуць запатрабаваны крэатыўнасць і творчыя прафесіі. Усё гэта пацягне кардынальнае змяненне жыцця грамадства.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук** ■

# Будучыня — з кнігай!

**Старт акцыі «Лета з добрай кнігай» быў дадзены ўчора ў мінскім гарадскім адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Лідар». Удзел у мерапрыемстве ўзялі намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага Сходу Мар'яна ШЧОТКІНА, міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ і міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА.**

Акцыя заклікана звярнуць увагу на важнасць чытання. Падчас яе аздараўленчыя лагеры будуць наведваць беларускія пісьменнікі і знаёміць дзяцей са светам літаратуры. У «Лідары» сустрэчу з хлопцамі і дзяўчатамі правёў Алесь Бадак — пісьменнік і дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура».

Мар'яна Шчоткіна падарыла выхаванцам лагера кнігі аб Нацыянальным сходзе Беларусі і парламенце Саюзнай дзяржавы.

«У Дзень абароны дзяцей трэба яшчэ раз звярнуць увагу на важнасць лёсу нашай краіны, бо ён залежыць менавіта ад новага пакалення. Сёння ў «Лідары» мы сустрэліся з адоранымі дзецьмі, якія ўдзельнічаюць у алімпіядах, займаюцца спортам і працягваюць вучыцца, нягледзячы на тое, што пачаліся канікулы. Гэта выдатна. Упэўнена, што наша краіна і наша будучыня — у надзейных руках», — падкрэсліла віцэ-спікер верхняй палаты парламента.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*



Фота БЕЛТА.

## НА АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ — КАНКРЭТНЫЯ АДКАЗЫ

Прамыя тэлефонныя лініі працягваюцца

**Міністры, кіраўнікі аблвыканкамаў, мэры і іх намеснікі ўжо адказалі на тысячы пытанняў і далі сотні даручэнняў адказным органам. Патэлефанаваўшы на прамую лінію, грамадзяне заўсёды могуць разлічваць на тое, што іх зварот будзе разгледжаны.**

Такая форма зносін у краіне створана ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.

**У гэтую суботу, 3 чэрвеня, з 9.00 да 12.00 на сувязь з грамадствам выйдуць:**

**Брэсцкі аблвыканкам**
намеснік старшыні САКОЎСКІ Віктар Яўгеневіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
намеснік старшыні МАЦКЕВІЧ Алег Сяргеевіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ПРЫВАЛАЎ Уладзімір Аляксандравіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ДЗЯШКО Уладзімір Іосіфавіч (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам**
кіраўнік справамі ВАРОНІН Рыгор Аляксандравіч (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам**
кіраўнік справамі ГУРЫНОВІЧ Уладзімір Аляксандравіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам**
першы намеснік старшыні РЫМАШЭЎСКІ Фёдар Віктаравіч (80172224444).

■ Знешняя палітыка

# ШУКАЕМ КЛЮЧ АД ДЗВЯРЭЙ У ЕЎРОПУ

**Наша краіна паэтапна рыхтуецца да таго, каб зрабіць межы з Еўрапейскім саюзам больш адкрытымі. Наступны раўнд перагавораў па спрашчэнні візавага рэжыму з ЕС адбудзецца 20 чэрвеня ў Мінску. Пра гэта паведаміў журналістам начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар МЗС Дзмітрый МІРОНЧЫК.**

«Да нас прыбудуць дзве групы экспертаў генеральнага дырэктара па міграцыі і ўнутраных справах Еўрапейскай камісіі. Адна група будзе займацца праектам пагаднення спрашчэння візавых фармальнасцяў, другая — праектам пагаднення аб рэадмісіі», — растлумачыў Дзмітрый Міронічк. Ён дадаў, што спіс няўзгодненых пытанняў па спрашчэнні візавых фармальнасцяў невялікі.

«Гэта прэтэнзіі Еўрапейскага саюза да бяспекі беларускіх дыпламатычных пашпартоў. Аднак ужо вядома, што да канца 2018 года ў нашай краіне пачнуць выпускацца біяметрычныя пашпарты, якія будуць адпавядаць самым сучасным патрабаванням бяспекі праязных дакументаў. Гэтая прэтэнзія з'яўляецца часовай і будзе знята ў найбліжэйшай перспектыве», — паабяцаў прэс-сакратар МЗС.

Ён падкрэсліў, што да заключэння пагаднення па візавай тэматыцы Беларусь ужо падрыхтавалася. Аднак жорсткім патрабаваннем ЕС застаецца падпісанне гэтага дакумента ва ўвязцы з пагадненнем па рэадмісіі. Але, па яго словах, там таксама няма непераадольных перашкод.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by* ■

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## 300 РУБЛЁЎ НА ЕЖУ

**Амаль траціну свайго бюджэту сем'і трацяць на харчаванне.**

Сярэднестатыстычная беларуская сем'я жыве на 983,5 рубля ў месяц. У гарадах і пасёлках гарадскога тыпу гэта сума складае 1054 рублі, у сельскіх населеных пунктах — 798. Такія даныя паказала выбарачнае абследаванне хатніх гаспадарак па ўзроўні жыцця за першы квартал 2017 года. Грашовыя расходы ў пераліку на сям'ю склалі 920,5 рубля ў месяц, з якіх 704 рублі (76,5 працэнта) прыпадаюць на спажывецкія расходы.

Больш за ўсё грошай ідзе на харчаванне (41,7 працэнта ў структуры спажывецкіх расходаў). На куплю непрадуктовых тавараў трацяцца 29,8 працэнта, на аплату паслуг — 25,5.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

## САМЫЯ ПРЫЦЯГАЛЬНЫЯ — ІНФАРМАТЫКА І МАТЭМАТЫКА

**У Ліцэі БДУ падвялі вынікі ўступнай кампаніі.**

Усяго было пададзена 1498 заяў, з іх 33 — ад пераможцаў рэспубліканскіх прадметных алімпіяд, якія залічваюцца без уступных іспытаў. Найбольшая колькасць абітурыентаў прэтэндавалі на паступленне ў хіміка-біялагічныя класы — 333. Конкурс туды склаў 8,6 чалавека на месца.

У матэматычныя класы паступіла 307 заяў (конкурс — 7,6 чалавека на месца), фізічныя — 222 (5,9 чалавека на месца), філалагічныя: беларуская і англійская мова — 123 (5,8 чалавека на месца), беларуская і руская мова — 91 (5 чалавек на месца). Гісторыка-грамадазнаўчы профіль зацікавіў 137 чалавек (3,2 прэтэндэнта на месца), хімічны — 107 (6 прэтэндэнтаў на месца).

А самы высокі конкурс (9,2 чалавека на месца) быў зафіксаваны на кірунку «інфарматыка, матэматыка»: на гэты профіль пададзена 178 заяў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## З 1 ЧЭРВЕНЯ БІЛЕТЫ «БЕЛАВІЯ» — ТОЛЬКІ Ў РУБЛЯХ

Наведвальнікі сайта з тэрыторыі Беларусі, а таксама ўладальнікі картак, эмітаваных беларускімі банкамі, цяпер змогуць расплачвацца за авіябілеты толькі ў беларускіх рублях. Тое ж датычыцца пакупак у касах «Белавія», паведамілі ў прэс-службе авіякампаніі. Умовы аплаты змянілі ў адпаведнасці з рашэннем Нацбанка.

## РОТА ТРЭНІРУЕЦЦА — РУХ АБМЯЖОЎВАЕЦЦА

**Напярэдадні дня Незалежнасці будуць праходзіць трэніроўкі зводнай роты ганаровай варты.**

У гэтай сувязі, як паведамілі ў дзяржаўным прадпрыемстве «Мінсктранс», будзе абмежаваны рух усіх відаў транспарту па праспекце Машэрава ад вуліцы Даўмана да праспекта Пераможцаў. Гэта адбудзецца 5, 8, 12, 15 і 22 чэрвеня ў перыяд з 22 да 24 гадзін і з 22 гадзін 19 чэрвеня да 5.30 20 чэрвеня. Рух аўтобусаў маршрутаў №№29, 44, 136 у названыя перыяды арганізуецца па праспекце Машэрава, вуліцы М. Багдановіча, праспекце Пераможцаў у абодвух напрамках з выкананнем прыпынкачных пунктаў «Ст. м. «Няміга», «Палац спорту» на ўчастку, які змяняецца.

## У ЧЭРВЕНІ Ў СТАЛІЦЫ ПРОЙДУЦЬ ДНІ ЗНІЖАК

**Гандлёвыя арганізацыі Мінска праводзяць у чэрвені акцыі «Дні зніжак», паведамілі ў галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама.**

Універмаг «Беларусь» 6, 8, 13 чэрвеня ўстанаўлівае зніжку 25% на нехарчовыя, 5% — на харчовыя тавары; 20, 27 чэрвеня — 20% на нехарчовыя, 5% — на харчовыя тавары. Для трымальнікаў дысконтных картак 2—4, 9—11, 15—18, 22—25, 29 і 30 чэрвеня зніжка складзе 22% на нехарчовыя тавары, 5% — на харчовыя тавары. У ГУМе 15, 29 чэрвеня — зніжка 20% на нехарчовыя, 5% — на харчовыя тавары. Для трымальнікаў дысконтных картак 16, 17, 30 чэрвеня зніжка складзе 22% на нехарчовыя тавары, 7% — на харчовыя тавары. У ЦУМе — зніжка 18% — 8, 15, 22, 29 чэрвеня. Гандлёвы дом «На Нямізе» прапануе пакупнікам кожную сераду і суботу чэрвеня зніжку 22% на нехарчовыя, 5% — на харчовыя тавары. Для трымальнікаў дысконтных картак кожную пятніцу чэрвеня зніжка складзе 22% на нехарчовыя тавары, 5% — на харчовыя тавары. У «Кірмашы» кожную сераду і пятніцу чэрвеня — зніжка 17%. Для трымальнікаў дысконтных картак 26 чэрвеня — 22%. ТАА «Старт-Х» прапануе кожную сераду чэрвеня зніжку 15%; увесь чэрвень зніжкі на самакаты, веласіпеды, ролікі — 15%, на халадзільнікі і газавыя пліты — 18%.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ДА ЗАЕЗДУ ГАТОВЫ!




*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Лагер, добра знаёмы яшчэ савецкім школьнікам, знаходзіцца непадалёк ад пасёлка Радашковічы, за 40 кіламетраў ад сталіцы. Тут улетку адпачываюць дзеці супрацоўнікаў не толькі прадпрыемства «ГАРЫЗОНТ», але і яшчэ больш чым 700 арганізацый Мінска і Мінскай вобласці.

Праз дарогу — лагер «Маяк», які цудам пазбегнуў закрыцця.

— Ён быў на балансе іншага прадпрыемства холдынга. Не акупляўся. І летам 2015 года проста не адкрыўся. З мінулага года мы далучылі яго да сябе. Цяпер за змену можам прыняць 1080 дзяцей, — расказвае **дырэктар Сацыяльнага комплексу «Кіруючай кампаніі холдынга «ГАРЫЗОНТ» і начальнік аздараўленчага лагера Вольга ІЛЫНА.**

Суседні «Маяк» прынялі ў дастаткова сціплым стане. Лагер больш за год не працаваў, і яго тэрыторыя стала зарастаць. Летась там пачалі рамонт. Абнавілі актавую залу, сталовую, адзін з жылых карпусоў. Цяпер у памяшканнях значна камфортней. Тут паставілі новую мэблю, «перашылі» столь, аздобілі сцены ў холе дэкаратыўнай тынкоўкай.

— Інтэр'ер у пакоях будзем узмацняць тэкстылем, — дадае начальнік лагера. — Нам у Гродне цяпер шыюць шторы і пакрывалы.

Работы на далучанай тэрыторыі яшчэ шмат. Затое вырашылася праблема дэфіцыту памяшканняў для гурткоў. Педагогі будуць задаволены.

Ідзём у галоўнае месца лагера — сталовую. Пакуль без стуку лыжак і паху баршчу. Для дзяцей будзе арганізавана пяціразовае харчаванне, дагаворы на пастаўку прадуктаў даўно падпісаны.

— За аснову мы бралі двухтыднёвае меню, рэкамендаванае Рэспубліканскім цэнтрам гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя. Школьнікі штодзень будуць атрымліваць фрукты, малочныя прадукты. У рацыёне абавязкова ўваходзяць кашы, супы, мяса, — расказвае Вольга Ілына.

За змену ў лагеры выпіваецца амаль дзве тысячы літраў кефіру, з'ядаецца 6,5 тысячы апельсінаў і 12,5 тысячы катлет. На тэрыторыі будзе працаваць буфет. Таму ў спякоту дзеці змогуць купіць сабе ваду і марожанае.

Пытанне бяспекі таксама пад кантролем. На варотах заўсёды стаіць вартаўнік, плюс на летні час у лагер камандзіруюцца два супрацоўнікі міліцыі.

Па словах Вольгі Ілыной, попыт на аздараўленчыя пуцёўкі расце другі год запар. У свеце сітуацыя неспакойная, вось бацькі і аддаюць перавагу адпачынку дома. На другую і трэцюю змены ўжо ў красавіку не было месцаў. Яшчэ па сто чалавек запісалі ў чаргу на той выпадак, калі хтосьці ад броні адмовіцца.

Да заезду дзяцей лагер рыхтуе не толькі матэрыяльную базу, але і выхаваўча-забаўляльную праграму. Для школьнікаў прыдумваюць розныя праекты. Напрыклад, дзецям старэйшага ўзросту ў мінулыя гады прапаноўвалі паспрабаваць сябе ў якасці аніматараў, прайсці прафесійна-арыентацыйнае тэсціраванне. Сёлета ахвотных будуць вучыць бізнес-мысленню.

Утрымліваць дзіцячы лагер прадпрыемству сёння няпроста, прызнаецца суразмоўніца.

— Але наш генеральны дырэктар Юрый Прадко падтрымлівае развіццё сацыяльнай сферы. Вельмі дапамагаюць гарадскія ўлады.

Лагер таксама стараецца зарабляць. Прапануе платныя праекты — заняткі па рабататэхніцы, кітайскай мове, курс для дзяўчат па этыкеце, макіяжы і стылі, англамоўную змену (сумесна з брытанскімі дзецьмі). А ў міжсезонне, калі тэрыторыя пераўтвараецца ў аздараўленчы комплекс для дарослых і дзяцей, прымае ў сябе спартакіяды і турзлёты. Каб да новага сезона меці магчымасць абнавіць яшчэ корпус.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*
*Мінск — Радашковічы — Мінск.*

### У тэму

● З 2003 года Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі выдаткоўвае грошы на летняе аздараўленне дзяцей у загарадных кругласутачных лагерах. Сродкі ідуць на зніжэнне кошту пуцёвак для школьнікаў са шматдзетных, няпоўных, малазабяспечаных сем'яў, дзяцей-інвалідаў. Сёлета на гэтыя мэты ФПБ накіравала 110 тысяч рублёў. Летась — 100 тысяч, што дазволіла на льготных умовах аздаравіць 2178 дзяцей.

● У цэлым матэрыяльная дапамога з прафсаюзнага бюджэту на куплю пуцёвак у мінулым годзе склала больш за 1,5 мільёна рублёў. Накіроўваецца таксама фінансаванне на набыццё мэблі ў лагерах, гульнявога і спартыўнага інвентару.

● Каб гарантаваць бяспечныя ўмовы знаходжання дзяцей у летніках, прафілактыку траўматызму, тэхнічныя інспектары працы правяраюць лагеры да пачатку сезона. Асаблівая ўвага ўдзяляецца гульнявым і спартыўным пляцоўкам.

● Спартыўны клуб ФПБ актыўна аздараўляе падчас летніх канікул школьнікаў са спецыялізаваных вучэбна-спартыўных устаноў. Летась у адмысловых лагерах (кругласутачных і дзённых) адпачылі і павысілі свае майстэрства 21 тысяча дзяцей.

### Лічыльнік

За пуцёўку для дзіцяці ў спартыўна-аздараўленчы лагер з кругласутачным знаходжаннем бацькам давядзецца аддаць у сярэднім 269 рублёў (сумы прыводзяцца з улікам датацый), з дзённым знаходжаннем — 23 рублі. Змена ў кругласутачным аздараўленчым лагеры будзе каштаваць 235 рублёў (у дзённым — 18 рублёў), у прафільным аздараўленчым з кругласутачным знаходжаннем не менш за дзевяць дзён — 25, у дзённым лагеры працы і адпачынку — 15. Памеры датацый на пуцёўкі павялічаны ў сярэднім на 9 працэнтаў.

# На танку Перамогі — нашчадак пераможцы



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Тое, што гэта менавіта тая трыццацьчацвёрка, сведчаць не толькі дакументы, а і прабоіны на корпусе — вораг сустрэў вызваліцеляў жорсткім супраціўленнем.

Ужо прайшло столькі часу, а танк па-ранейшаму на ходу. Старшы лейтэнант Дзяніс Зяваліч, які падчас парада з'яўляецца камандзірам танка, свой удзел у галоўнай урачыстасці краіны трымае ў сакрэце нават ад родных. Аказваецца, яго дзед, Яраслаў Зяваліч, у далёкім 1944-м вызваляў Мінск. Ды яшчэ і на танку Т-34! Праўда, іншай мадыфікацыі.

Усяго на парадзе будзе задзейнічана звыш 280 адзінак баявой тэхнікі — у параўнанні з папярэднім годам колькасць парадных разлікаў павялічана амаль у два разы! Механізаваная калона расцягнецца прыкладна на тры кіламетры.

— Для ўдзелу ў парадзе адабраны самыя лепшыя, дысцыплінаваныя ваеннаслужачыя, якія падчас падрыхтоўкі будуць павышаць сваё майстэрства кіроўцы, удасканальваць уласныя веды па тэхнічнай частцы ўзбраення і ваеннай тэхнікі, у тым ліку маршавую падрыхтоўку, — адзначыў **намеснік камандуючага войскамі Паўночна-заходняга аператыўнага камандавання Узброеных Сіл палкоўнік Уладзімір КУЛАЖЫН,** які адказвае за падрыхтоўку механізаванай калоны да парада. — Парадныя разлікі складаюць каля 30% узораў узбраення і ваеннай тэхнікі, якія створаны і мадэрнізаваны на айчынных прадпрыемствах.



У прыватнасці, ракетныя сістэмы залпавага агню «Паланэз». Гонар айчыннага абаронна-прамысловага комплексу ўжо двойчы ўдзельнічаў у парадзе, але менавіта сёлета ён упершыню будзе прадэманстраваны шырокай публіцы як самастойны дывізіён Узброеных Сіл. Па словах экспертаў, зброя ўнікальная. Але, як прызнаюцца тыя, хто непасрэдна кіруе «Паланэзам», ён настолькі просты, што дастаткова два-тры тыдні, каб асвоіць тэхніку.

— У парадзе будуць удзельнічаць машыны баявога кіравання, баявыя машыны і транспартна-зараджаючыя машыны комплексу «Паланэз» — усяго 6 машын, — расказвае **камандзір 77-га асобнага рэактыўнага артылерыйскага дывізіёна 336-й артылерыйскай брыгады Міхаіл КРЫВАШЭЙ.** — Яшчэ тры машыны будуць прадстаўлены для прагляду грамадзянскаму насельніцтву для арганізаванай выстаўцы.

Эксклюзіў сёлетняга парада днямі раскрыў міністр абароны. Пасля таго як пройдуць парадныя разлікі і скончыцца афіцыйная ўрачыстасць, гледачы парада змогуць бліжэй пазнаёміцца з тэхнікай: разгледзець яе, сфатаграфавацца і нават дакрануцца. У тым ліку і да найноўшых распрацовак беларускага ВПК — упершыню на мінскі праспект выедуць браніраваныя машыны «Кайман» і «Волат», радыёрэлейныя станцыі, мабільныя зенітныя артылерыйскія комплексы «Зеніт», выратавальная і медыцынская тэхніка.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

# «ДЗЕЎКІ Ў ЛУГ ПАЙШЛІ, СТО РУБЛЁЎ ЗНАЙШЛІ»

## Навошта праводзіць русалку за вёску?

**У панядзелак пасля Сёмухі ў нашых продкаў традыцыйна пачынаўся Русальны тыдзень. На Мінशчыне, таксама як і ў астатніх рэгіёнах Беларусі, за выключэннем Гродзенскага Панямоння, гэты тыдзень вельмі шанавалі, не пачыналі ніякай работы, не пралі, не ткалі, не вілі вяровак, не гарадзілі платоў, каб у гаспадарцы не здарылася якога-небудзь няшчасця. Таму невыпадкова і мы разам з праектам «Наперад у мінулае» на працягу чэрвеня будзем расказваць пра Русалле. Дарэчы, сама назва гэтага свята выводзіцца ад лацінскай назвы антычнага свята руж. Мы ж кіруемся на Любаншчыну і Хойнічыну.**

### РУСАЛЛЕ?

Для нашых продкаў Русальны тыдзень па значнасці стаяў у адным шэрагу з Калядамі, Масленіцай і Вялікодным тыднем і даволі рэзка абмяжоўваў прастору чалавечай дзейнасці, фактычна звужаючы яе да межаў сядзібы і вёскі. Усё астатняе наваколле на гэты час становілася надзвычай небяспечным і непажаданым для любой дзейнасці.

Гэты тыдзень быў своеасаблівым завяршальным акордам вясны, пары росквіту і буяння жыццёвых сіл прыроды. У некаторых мясцовасцях асобнымі элементамі, а нават і цалкам ён (як правіла, восьмы тыдзень пасля Вялікадня) уключаўся ў купальскае свята (у некаторых мясцовасцях наогул святкаваўся перад Купаллем). Абрад праводаў русалкі звязаны са з'яўленнем на зямлі ў гэты час русалак «з таго свету» і вяртаннем назад «у магілкі».

Сама ж русалка выступае як захавальніца ўрадлівасці, адна з апякунак пладаноснай зямлі і распарадчыкаў воднай стыхіі. Са старажытнасці нашы продкі верылі, што дрэвы і расліны мелі душу, як і людзі чалавек. Яны спрабавалі з дапамогай гамеапатычнай, або імітатыўнай, магіі (заснаваная на законе падабенства, згодна з якім падобнае выклікае падобнае або вынік падобны на яго прычыну) паскорыць рост дрэў і раслін. З гэтай мэтай ладзіліся абрадавыя ігрышчы, якія з'яўляліся магічнымі заклінаннямі, накіраванымі на тое, каб прымусіць лясы пакрыцца зеленню, травы — прарасці, пасевы — падняцца, кветкі — распусціцца.

На Любаншчыне на заканчэнні Русальнага тыдня здзяйснялі своеасаблівы абрад: дзяўчаты плялі вянкі, палілі вогнішча, вадзілі карагоды вакол яго, спявалі песні і кідалі вянкі ў агонь. Адной з мэт выканання абраду было выклікання дажджу для забеспячэння палеткаў вільгаццю.

### РУСАЛКІ — ХТО ЯНЫ?

Сама русалка ў розных мясцінах увасаблялася па-рознаму: пераапранутая дзяўчына, лялька (чучала), нябачная міфічная істота, якая хаваецца ў жыце і да якой ідзе дзявочае шэсце. Чучала русалкі на Хойнічыне рабілі з куля саломы — уніз калоссем, а ўверх камлём, перавязвалі чырвоным поясам, выразалі шыю, галаву, на якую надзявалі чапец, спадніцу, з дзвюх жменяў саломы рабілі рукі, якія абкручвалі хусткамі. На шыю завязвалі чырвоную хустку; спераду падвязвалі чырвоны фартух, малявалі фарбамі твар і надзявалі вянок. Пакуль не сцямнее, русалачку-чучала хавалі ў каморы, а потым бралі пад рукі і вялі на ўзгорак. Тройчы спявалі песню, а тады вялі яе ў жыта. Лічылася, што ў жыце русалка прападае, бо ўся адзежа на ёй паганая.

Часам у абрадзе выкарыстоўваецца вянок. Ён становіцца заменнікам русалкі. Сімвалічным месцам дзейства з`яўляецца пагорак. Русалку, перш чым весці ў жыта, вялі на пагорак, дзе разам з ёю вадзілі карагод. Другое свяшчэннае месца, куды праводзілі русалак, — могілкі. Такі звычай быў распаўсюджаны ў Брагінскім і Нараўлянскім раёнах Гомельскай вобласці. Дзяўчаты з вянкамі ў адных сарочках увечары ішлі да могілак, спяваючы русальныя песні. Да могілак трэба было прыйсці тройчы.

### КІРУЕМСЯ НА ХОЙНІЧЧЫНУ

На Хойнічыне мясцовыя жыхары лічаць, што абрад нездарма стаў традыцыйным для іх супольнасці. Па народным павер'і, русалкамі становяцца дзяўчаты, якія памерлі цнатлівымі на русалачным тыдні. Яны звычайна жывуць у вадзе — у вірах, твані, але, калі зацвітае жыта, яны па расе перабягаюць туды. І там робяць заломы, весяляцца. Яны зусім голыя, як маці нарадзіла, з вяночкамі кветак на галовах. Не дай бог трапіць ім у рукі — залaскаюць, зашлакочуць.



Фота Сяргея ВЫСКВАРКІ.

Дарэчы, пра русалак пісаў у сваіх нарысах бацька Максіма Багдановіча Адам Ягоравіч: «В воде же живуть русалки. Они, впрочем, могуть считаться «земноводными», потому что обитають в воде только с осени до «русальной недели» (первая после Троицы). Тогда они выходят из воды и поселяются на ветвях деревьев, особенно на берёзах. Русалки качаются на их гибких ветвях, подзывая прохожих: «Человек! Человек! Ходи калыхаться!» А если кто сдуру подойдёт к ним близко, то они защекочуть его до смерти. Представляются они воображению белоруса красивыми женщинами с распущенными длинными волосами. Пока русалки не выйдуть из воды, т. е. до русальной недели, считается опасным купаться, потому что или болезнь какая-нибудь приключится, или русалки себе затащат в глубь реки и утопят. Существует поверье, что дети, умершие до крещения, превращаются в русалок».

У вядомага даследчыка даўніны Еўдакіма Раманава чытаеш: «На русалку выбіраюць дзеўку маторную. Косы ей распусцяць, адзежу знімуць, на плечы андарак ускінуць. І плятуць вянок із васількоў, хмелю, зорачак. Вянок бальшы. Колькі дзевак е, толькі і вянок плятуць. Надзенуць ей, русалцы, етый вянок і вядуць у жыто. І пяюць, і барабаняць у дошкі, у заслонкі, і агні паляць. Ну, прывядуць яе к жыту і піхнуць у жыта; вянок знімаюць, андарак разрываюць і бягуць уцікаць. А яна (голая) за імі, да ў ладкі плешча».

Русальны тыдзень тут даўней святкавалі на працягу трох дзён — у нядзелю, панядзелак, аўторак — і называлі Тройцай. Па сведчанні беларускага празаіка Барыса Сачанкі, двор, хату ўпрыгожвалі зялёнымі бярозкамі, галінкамі клёну, ліпы. Дзяўчаты, па-святочнаму апранруўшыся, збіраліся ў купкі і спявалі песні. У гэтыя дні нельга было купацца, бо маглі злавіць русалкі. Традыцыю правядзення абраду праводаў русалкі сучасныя ўдзельнікі пераняли ад сваіх продкаў — прабабуль, бабуль і матуль, захаваўшы і выкарыстоўваючы пры гэтым традыцыйныя прадметы: касцюмы, вялікі і маленькія абрадавыя вянкі.

Спачатку кожная жанчына ідзе ў свой сад, нарывае кветак, сплятае сабе маленькі вянок, апранае традыцыйны строй і ідзе ў прызначанае месца, дзе збіраюцца аднавяскоўцы. Тут жанчыны з вянкамі на галовах плятуць з падрыхтаваных загадзя галінак і кветак галоўны — вялікі вянок. Другая частка жанчын упрыгожвае русалку — маладую дзяўчыну — галінкамі і лісцямі клёну. Галіна Харошка кажа: «Русалка характарызавалася як незамужняя, прыгожая і дэманічная істота, якая рабіла шкодныя рэчы, таму яе трэба прагнаць з нашай вёскі».

Потым, калі ўпрыгожана русалка і сплецены вянкі, усе ўдзельнікі абраду выбудоўваюць шэсце, дзе наперадзе ідзе русалка з аховай — мужчынам сталага ўзросту і маладым хлопцам. Яны трымаюць у руках крапіву, каб адганяць непаслухмяных дзяцей, якія стараюцца раней сарваць зеляніну з русалкі.

Як толькі спявачкі завядуць русальную песню «Праваду, праваду русалачку да бору», вялікае шэсце накіроўваецца праз вёску да жытнёвага поля. Ісці да поля, што у канцы вёскі, далёка, таму неадназова выконваюцца ўсе хойніцкія русальныя песні:

*Праведу русалку да бору,*
*а сама вярнуся дадому.*
*Праваду русалку да мяжы,*
*а сама вярнуся да дзяжы.*
*Праваду русалку ў шчыры бор,*
*а сама вярнуся*
*ў таткаў двор...*

Удзельнікі абраду спяваюць песні і нясуць вялікі вянок, пасля іх ідуць усе астатнія. Шэсце рухаецца праз усю вёску да жытняга поля. Калі ўдзельнікі шэсця падыходзяць да жытнёвага поля, адна група (старэйшыя жанчыны) пачынае вадзіць карагоды з русальнымі песнямі вакол распаленага вогнішча, а моладзь і дзеці гоняць русалку ў жыта, зрываюць з яе зелле і нясуць да вогнішча, каб асвяціць яго. Калі русалку разарвалі, асвячалі агнём малыя вянкі і галоўны вялікі вянок, пасля чаго яго разрывалі. Пасля заканчэння свята гэтае зелле неслі на агароды, каб накрыць капусту.

Як бачым, русалку мы прагналі, зямля і прырода ўвайшлі ў сілу, таму чакаем Купалля, каб разам купалаваць, вадзіць карагоды вакол вогнішча і, натуральна, парамі скакаць цераз яго, каб ачысціцца ад злых духаў.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*



## «СМАЧНАЕ ЛЕТА СА «ЗВЯЗДОЙ»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на III квартал або на II паўгоддзе 2017 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 8 ліпеня 2017 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.



Набор мебели садовой Tarifa lounge wikbrw-std lounge

Сярод падпісчыкаў 12 ліпеня 2017 года будуць разыграны 7 мангалаў Forester і суперпрыз — набор садовай мэблі Tarifa longe. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 22 ліпеня 2017 г.



Мангал Forester BC-781 с шампурами

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 30 верасня 2017 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або II паўгоддзе 2017 г. і пашпарта. Пасля 30 верасня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Смачнае лета са «Звяздой» чытайце ў нумары 95 газеты «Звязда» ад 23.05.2017 г.

Тэлефон для даведак: (017) 284 44 04.

Тэрмін правядзення гульні — з 26.05.2017 па 30.09.2017.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №3002 ад 16.05.2017 г., выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або II паўгоддзе 2017 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________

____________

Падпіска аформлена і аплачана ў ____________
(аддзяленне сувязі)

____________ на III квартал або II паўгоддзе 2017 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) [    ] (індэкс) ____________

____________

____________

Удачы ў розыгрышы!

## наступны тыдзень



**ШАЛІ.** Вы нарэшце адчуеце сілу для новых здзяйсненняў, гэта дазволіць прыняць удзел у разнастайных праектах і вырашэнні самых незвычайных пытанняў, пра якія вы раней нават і думаць не маглі. Багацце ідэй дапаможа праявіць сябе ў якасці лідара, заадно раскрыўшы вашы арганізатарскія здольнасці. Магчыма, прыйшоў час для павышэння па службе. Тыдзень будзе насычаны кантактамі, паездкамі, сустрэчамі і зносінамі. У выхадныя дні абавязкова знайдзіце час для старых сяброў, пажадана — як мага больш.



**СКАРПІЁН.** Тыдзень складаны, але цікавы. Гарантыя поспеху — не губляць аптымізму і ўмець захоўваць душэўную раўнавагу ў любым становішчы. Першую палову тыдня давядзецца прысвяціць нейкім клопатам і высвятленню непаразуменняў. Вы можаце адчуць сябе ў баку ад самых важных падзей. Але ўжо пачынаючы з серады ўсё будзе атрымлівацца з лёгкасцю. І ўсе мары здзейсняцца. Вам прапануюць цікавую працу, вернуць старыя даўгі, парадуе каханы чалавек.



**СТРАЛЕЦ.** Час падняць прафесійную планку, зрабіць што-небудзь для сябе і сваёй будучыні. Дзелавыя сустрэчы з партнёрамі ў першай палове тыдня акажуцца вельмі паспяховымі. У аўторак спатрэбіцца ўменне дамаўляцца і шукаць новую інфармацыю. У сераду лепш не трапляцца на вочы начальству. У сям'і магчымы канфлікт, калі будзеце ўпарціцца ў сваіх памылках. У выхадныя не сядзіце дома, а лепш выбірайцеся ў госці. Навакольныя будуць падтрымліваць вас у творчых пачынаннях.



**КАЗЯРОГ.** Паспрабуйце не прыспешваць падзеі і прымаць іх такімі, якія яны ёсць на самай справе, стараючыся не перанасычаць карціну як ружовымі, так і чорнымі тонамі. Галоўнае — не мітусіцца, а спакойна вырашаць пытанні, якія ўзнікаюць. Паспрабуйце не казаць нічога лішняга, каб не стаць ахвярай плётак. Дапамажыце калегам па працы, але не давайце нікому садзіцца сабе на шыю. У аўторак лепш не спрачацца з начальствам, яно ўсё роўна не пачуе вашы нават самыя важкія аргументы і цікавыя прапановы. У выхадныя адпачніце на прыродзе.



**ВАДАЛЕЙ.** На гэтым тыдні вы з лёгкасцю разберацеся з праблемамі на працы і ў асабістым жыцці. Галоўнае — быць больш уважлівымі да новых ідэй, нават калі на першы погляд яны здаюцца абсурднымі. Панядзелак можа аказацца ўдалым днём для перамен, у тым ліку і змены месца жыхарства ці працы. У сераду фінансавымі пытаннямі займацца не варта. У суботу магчыма нечаканая, але своечасовая дапамога ад сваякоў.



**РЫБЫ.** Адпусціце з мірам сваё мінулае, аддайце даўгі і падвядзіце нейкі вынік. Вас могуць чакаць цікавыя сустрэчы і паездкі. Магчымы новыя дзелавыя прапановы, але спяшацца з імі не варта. Маленькія цяжкасці лёгка адступяць, а больш сур'ёзныя толькі распаляць вас. Рэкамендуецца праявіць актыўнасць і настойлівасць у рэалізацыі сваіх планаў. У сярэдзіне тыдня спадзявайцеся на свае сілы, але і ад дапамогі не адмаўляйцеся. У пятніцу могуць адбыцца прыемныя падзеі ў асабістым жыцці.

## Чацвер, 8 чэрвеня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.15** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.40** Зона Х.
**8.50** Выпускныя экзамены па беларускай і рускай мовах, па матэматыцы за перыяд навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі.
**9.10, 10.05 Серыял «Непадсудныя».***
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00** Дзіцячы доктар.
**11.35, 12.10, 20.00 Серыял «Гаспадыня».***
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «Маёр і Магія».***
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Нашы.
**15.45, 16.05** «Выратуйце нашу сям'ю».***
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.00** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Спецыяльны рэпартаж.
**22.00 Серыял «След».***
**0.35** Дзень спорту.
**0.45 Серыял «Апошняя сустрэча». Заключная серыя.***

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.05** Тэлебарометр.
**9.05, 18.55 Меладрама «Жамчужына палаца».***
**10.20, 16.05** «Багіня шопінгу». Фэшн-шоу.
**10.50, 16.30 Серыял «Кухня».***
**12.00, 22.10** «Бітва экстрасэнсаў. 15-ы сезон».
**14.00, 17.45** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20, 0.05** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**20.10** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу.
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.40** «Беларуская кухня». Фаршыраваныя яйкі.
**8.05, 12.00, 20.15** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15, 15.50, 20.30, 23.15** «Гэты дзень».
**8.25, 18.55 «Зімовая вішня». Меладрама.***
**9.20, 12.45 «У пошуках капітана Гранта». Маст. фільм.***
**10.30** «Камертон». Дырыжор, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Віктар Бабарыкін.
**10.55, 15.55 «Чыста англійскія забойствы». Дэтэктыў. «Сямейныя разборкі». 1-я серыя.***
**11.45** «Белавежская пушча».
**12.20** «Наперад у мінулае».
**13.55** Канцэрт-закрыццё XVII Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2017», прысвечаны 45-годдзю Заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь ансамбля «Сябры».
**15.25** «Тэатр у дэталях». Спектакль Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі «Раскіданае гняздо».
**16.45, 21.05** «Тайны вайны. Невядомыя разведчыкі».*
**17.25, 21.40 «Замах». Дэтэктыў.***
**19.50** «Мастакі Парыжскай школы. Ураджэнцы Беларусі». Восіп Цадкін.
**20.40** «Калыханка».
**23.20** «Вершы і музыка, любоў і Пецярбург». X марафон аўтарскай песні, прысвечаны дню нараджэння А. С. Пушкіна.

### Беларусь 5

**8.00** Тэніс. Ралан Гарос. 1/4 фіналу.
**10.00** Футбол. Таварыскі матч. Беларусь (U-21) — Сан-Марына (U-21).
**11.55** Козел пра футбол.
**12.15** Слэм-данк.
**12.45** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Фінал чатырох. Фінал.
**14.25** Мастацкая гімнастыка. Challenge cup. Гвадалахара.
**16.00** Тэніс. Ралан Гарос. 1/2 фіналу. Жанчыны. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**20.30** Лёгкая атлетыка. Брыльянтавая ліга. Рым.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.15** «Смак».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.15, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20** «Кантрольная закупка».
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік.
**19.00** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «А ў нас у двары». ***
**23.00** «Вячэрні Ургант».
**23.40** «Давай пажэнімся!».
**0.35** «На ноч гледзячы».
**1.30** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.25** «Тайны Чапман».
**9.30, 17.35** «Званая вячэра».
**10.40, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**11.30** «Глядзець усім!»
**11.50, 0.15 «Меч». Серыял.**
**13.50** «Сакрэтныя тэрыторыі».

### МІР

**6.35, 10.00** М/ф «Маша і Мядзведзь».0
**7.00** Добрай раніцы, свет!***
**8.35** «Няма праблем!» ***
**10.10** «Цяжар абеду».*
**10.40** «Любімыя акцёры». Леанід Гайдай.*
**11.10, 1.25 Маст. фільм «Зімовая вішня».0**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15 Маст. фільм «Іншы твар».***
**15.00** Дак. фільм «Сямейныя драмы».***
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».***
**19.20, 4.20 Серыял «Закон і парадак».***
**23.10 Маст. фільм «Прафесар у законе».***
**2.55 Маст. фільм «Гарачы лёд».***

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.00** «Пакой смеху».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Айцец Мацвей».**
**19.15, 20.40 Серыял «Чэрчыль».**
**21.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**15.35** «Усім па катку».
**15.55** «Мінск і мінчане».
**16.50 «Салдаты і афіцэры». Серыял.**
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Дзіўная справа».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.05** «Аўтапанарама».
**1.50** «Дакументальны праект»: «Змова паўшых».
**22.00, 23.10 Серыял «Ідэальная ахвяра».**
**0.05** «Паядынак».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.05** «Дачны адказ».
**7.10, 8.05 Серыял «Час Волкава».***
**9.00 Серыял «Мухтар. Новы след».***
**9.45, 23.20** «НЗ.by».
**10.20 Серыял «Ляснік».***
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 16.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Дарожны патруль».***
**17.05 Серыял «Сведкі».***
**19.40 Серыял «Шэф. Гульня на павышэнне».***
**23.40** «Вынікі дня».
**0.10 Серыял «Пагоня за ценем».***

### 8 канал

**7.00, 15.50, 19.20, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** М/с «Нязнайка на Месяцы».
**8.00 Серыял «Анёл у сэрцы».**
**9.00, 17.40 Серыял «Грандатэль».**
**10.15** «Сябры Дзядулі Марка».
**10.30** «Вяселле па разліку».
**11.00 Меладрама «Фліка».**
**12.35, 19.25 Серыял «Імперыя».**
**14.05 Камедыя «Прыгонная актрыса».**
**15.55** «Мультпарад». «Маўглі».
**16.15** «Мой любімы гадаванец».
**16.45 Серыял «Я кахаю».**
**19.10** «Фэшн is my прафэшн».
**20.55** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.15 Дэтэктыў «Кравец з Панамы».**
**23.00 Серыял «Тыран».**

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».***
**6.30, 4.25** «Ералаш».0
**7.30, 3.25** М/ф «Фіксікі».0
**7.50, 3.45** М/ф «Смяшарыкі».0
**8.10, 4.05** М/ф «Тры каты».0
**8.30, 15.10, 19.00** Серыял «Атэль «Элеон»-2».***
**9.30** Баявік «22 хвіліны».*
**11.15** Скетч-шоу «6 кадраў».***
**12.00, 2.20** «Лаві момант».***
**12.30, 5.10** Серыял «Метад Лаўровай».***
**13.30** «Дом мары».***
**14.00, 20.10** Серыял «Дах свету».***
**16.20, 0.50** Серыял «Васьмідзясятыя-5».***
**16.50** Серыял «Закрытая школа-3».***
**17.50, 23.10** «Уральскія пельмені».***
**21.20** Баявік «Няўлоўныя».***
**0.00** Серыял «Карабель».***
**1.20** «Дурні і дарогі».***
**1.40** Серыял «Бязмоўны сведка».***
**2.40** «Не можа быць!»***

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.45** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15** «Каломба». Серыял.
**12.30** «Гісторыя Сямёнаўскага палка, або Небывалае бывае». Дак. фільм.
**13.15** «Расія, любоў мая!» «Узоры народаў Расіі».
**13.45** «Гонкі па вертыкалі». Маст. фільм.
**14.50** «Томас Алва Эдысан». Дак. фільм.
**15.10** «Заваяванне Сямі мораў». Дак. фільм.
**16.05** Карыфеі расійскай медыцыны. Сяргей Боткін.
**16.35** «Мой дом — мая слабасць». Дак. фільм.
**17.15** «Больш, чым каханне». Ала Ларыёнава і Мікалай Рыбнікаў.
**17.55** «Бібліятэка Пятра: слова і справа». Дак. фільм.
**18.25, 1.15** Расійскія зоркі выканальніцкага мастацтва.
**19.05** Колер часу. Жорж-П'ер Сёра.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.00** «Абсалютны слых».
**20.40** Ступені цывілізацыі. «Апошні прыстанак тампліераў». Дак. фільм.
**21.30** «Рэгтайм, або Разарваны час».
**21.55** «Заўтра не пампрэ ніколі». Дак. серыял.
**22.25** «Энігма». Франгіз Алізадэ.
**23.05** «Каця і прынц. Гісторыя адной выдумкі». Дак. фільм.
**0.00** Мастсавет.
**0.05** «Тэорыя ўсеагульнай кантактнасці Элія Бялюціна». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Ленінградскае ТБ. Прарыў». 2006 год.*
**7.00, 8.35, 9.40, 11.25, 15.40, 21.40, 1.05, 2.35, 3.40** Музычная настальгія.*
**7.20** Фільм-спектакль «Юнона і Авось».***
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».*
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».*
**12.00, 18.00** «Яловая субмарына». 60-годдзе Аляксандра Ліпніцкага. 2012 год.***
**12.50** Праграма «Час пік» з У. Лісцьевым. 1994 год.*
**13.20** Фільм-спектакль «Таблетку пад язык». Пастаноўка В. Плучак.*
**17.00, 23.00** «Песня-78». 1-е аддзяленне.*
**18.50** Маст. фільм «Дзесяць негрыцянят».***
**0.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Свярдлоўскі рок». 2005 год.***
**1.20** Тэлефільм «Вір».***
**5.00** Фільм-канцэрт «Міхаіл Жванецкі. Сам-насам з сабой...» 1992 год.*

### EuroSport 1

**4.00, 7.30, 12.00, 16.00, 18.15, 0.00, 2.30** Тэніс. «Ралан Гарос».
**5.30, 10.15, 20.30** Тэніс. «Ралан Гарос». Супрацьстаянне дня.
**6.30, 9.30, 21.30** Веласпорт. «Крытэрыум Дафінэ».
**10.45, 22.30** Футбол. Чэмпіянат свету сярод маладзёжных каманд (U-20).
**13.00** Тэніс. «Ралан Гарос». Мікст. Фінал.
**15.45, 18.00** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс»-экстра.
**20.00, 2.00** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс».

### Кінакамедыя

**0.50** Камедыя «Дзіўныя сваякі».***
**2.30** Меладрама «Амелі».***
**4.35** Скетчкам «Паміж намі».***
**5.00** Камедыя «Развод паітальянску».*
**6.55** Камедыя «Кахаю цябе на ўсіх мовах свету».***
**8.40** Камедыя «Шпіён па суседстве».*
**10.25** Камедыя «Хлопец з нашых могілак».*
**12.00** Камедыя «Снежны анёл».*
**14.10** Камедыя «Я, тата і сабака».*
**16.00** Камедыя «Палярны рэйс».*
**17.40** Камедыя «Пагоня за трыма зайцамі».*
**19.30** Камедыя «Кухар на колах».***
**21.30** Камедыя «Каханне і лімоны».***
**23.15** Камедыя «Смак цудаў».***

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.55** «Ёсць адзін сакрэт».
**8.20** «Доктар І...»
**8.50, 19.00** «Вузел лёсу». Серыял.
**10.25, 3.35** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**12.05** «Сляпая».
**13.05** «Варажбітка».
**14.10, 5.10** «Паралельны свет».
**15.10** «Трэндзі».
**15.40** «Здзелка».
**16.10** «Натуральны адбор».
**17.05** «Адкрыта».
**18.00** «Цікаўная Варвара». Серыял.
**20.50** «Спатканне з зоркай».
**22.00** «Рэвізора».
**23.00** «Алігарх-ТБ».
**23.30** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.15** «Пачатак». Фантастыка.***
**2.40** «Амерыканскі жаніх».

### ТБ1000

**6.10** Успаміны пра будучыню.***
**8.35** Хлусня дзеля выратавання.***
**11.05** Прывітанне, Джулі!***
**13.05** Гісторыя рыцара.*
**15.40** Цёмная даліна.****
**18.05** Сур'ёзны чалавек.***
**20.10** Назад у будучыню I.*
**22.30** Назад у будучыню II.*
**0.40** Назад у будучыню III.*
**2.50** Зімовая спячка.*

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Палюбоўнік.***
**8.25** 14 +.***
**10.35** Прыкідваючыся ахвярай.***
**12.40** Старое добрае кіно. Акадэмія пана Кляксы. 2-я серыя.
**14.20** Тры волаты і Марскі цар.
**16.00** Дзень дурня.***
**17.55** Рускі трохвугольнік.***
**20.20** Тыдзень Кінатаўра. Добры хлопчык.*
**22.20** Тыдзень Кінатаўра. Жыць.***
**0.45** Тыдзень Кінатаўра. Выратаванне.***
**2.40** Асаблівасці нацыянальнага палявання.***
**4.20** Агні прытона.***

### National Geographic

**6.00, 13.25** Гульні розуму.*
**6.50, 14.10, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.*
**8.00, 10.25, 14.55** Мегазаводы.*
**8.50, 11.10, 15.40** Шаша праз пекла.*
**9.40, 20.15** Аўта-SOS.*
**11.55, 16.30, 19.30, 23.15, 2.20** Расследаванні авіякатастроф.*
**12.40, 18.45, 21.45, 1.35, 4.45** Космас: прастора і час.*
**18.00, 21.00, 0.50, 3.55** Сапраўдны суперкар.*
**22.30** Ліхтугі за мяжой.***

### Discovery

**8.00, 14.00, 0.00, 3.50** Выжыць любой цаной.***
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?*
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?*
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Паляўнічыя на рэліквіі.*
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Паляўнічыя на склады.***
**11.00** Найлепшы мадэліст.*
**17.00, 22.00, 6.20** Махінатары.*
**18.00, 2.55** Харлі і браты Дэвідсан.***
**19.00, 1.00** Абаронцы акіяна.***
**20.00, 2.00** Легенда пра золата кракадзілаў.***
**4.40** Маланкавыя катастрофы.***

■ Простая мова

# КУКАВАЛА ЗЯЗЮЛЯ...

**У краіне-суседцы павышаюць, як быццам, пенсійны ўзрост. Нехта — як некалі ў нас — кажа, што гэта трэба, нехта — сцвярджае, што не... Прычым кожны — сваімі сродкамі. Адзін з мастакоў-гумарыстаў дзвюх бабуль намаляваў: старэнькіх, у крук сагнутых, на кавеньKі свае абапіраюцца — некуды ідуць... Зверху надпіс: «Ведаем, што на працу, але не памятаем куды».**

Складанае пытанне.
І не толькі для іх.

## «БАРТАР»

Вечар. Аўтобус: новы прыпынак — новыя пасажыры. Гэтым разам — маладая матулька з дзіцем. Харошанькі хлопчык, гадоў, можа, пяць. Не маленькі, здавалася б, але ж вочкамі шукае, дзе б хутчэй сесці.

— Тут сядайце, — паволі ўстаючы, прапануе адзін з мужчын і ўжо ў адрас хлопчыка дадае: — Але я не дарма табе месца саступіў, а ў доўг. Давай з табою дамовімся: ты, калі вырасцеш, уступіш мне, добра?

— Добра, — згодна ківае хлопчык і, усеўшыся, хвілін з дзесяць засяроджана маўчыць, час ад часу пазірае на мужчыну.

Падобна, хоча запомніць яго ў твар, каб потым, калі вырасце, не пераблытаць.

## УРОК

...Сто разоў казалі малой (ёй 13), што з мабільніка праз навушнікі нельга слухаць музыку (прынамсі, доўга), тлумачылі, што гэта нядобра — найперш для здароўя... Але ж для тэлефона таксама, бо сканчыцца зарад...

Дзяўчынка чула і не чула. Ёй даводзілі зноў і зноў, пакуль...

Неяк яна з іншымі дзецьмі на экскурсію паехала. Дарогі тую (і не блізкі ж свет — у Полацк), можна сказаць, не заўважыла (бо з раніцы, з музыкай), а вось назад...

Зарад у тэлефоне і сапраўды скончыўся. Дзеці вакол былі незнаёмыя. Папрасіць у некага мабільны, каб патэлефанаваць бацькам і сказаць, у колькі прыедзе (тыя абяцалі сустрэць), яна не адважылася. Аўтобус ішоў са спазненнем...

Дамоў у выніку ехала адна, праз увесь горад.

І з прыпынку ішла адна, можна сказаць, па цёмначы...

Можа, зразумела, для чаго — найперш — патрэбен тэлефон?

## НА ВАКЗАЛЕ

Анекдот: «Півавар Гельмуд Штольц пабываў у Расіі. Некаторыя рэчы яго здзівілі, некаторыя абурылі, некаторыя ў яго ўкралі». Дзе ён сам тады быў, незразумела.

...Іншая рэч вось гэты гаспадар. Ён свае рэчы пакінуў каля лаўкі, на прыпынку, а сам адхінуўся — пайшоў купляць талоны на праезд, а ў гэты час...

Не, яго сумкі нікога не зацікавілі. Хіба сабаку? Той падышоў, абнюхаў, падняў нагу...

Трэба разумець, якія рэчы, такі іх лёс?

## МОЦНЫ АРЭШАК

Класіка: «Пить можно всем, необходимо только знать: где и с кем, за что, когда и сколько».

А вось чаго (канкрэтна: віна, каньяку, гарэлкі...), паэт не напісаў. А таму досыць інтэлігентны дзядок з кійком, прытэпаўшы ў спецыяльны аддзел, да бутэлек прыглядаецца доўга.

— Скажыце, а «Моцны арэшак» гэта што? — пытае нарэшце ў крамніцы.

— Гэта настойка. І досыць моцная, — з ахвотай тлумачыць жанчына, ужо трымаючы пляшку. — Мае знаёмыя бралі яе. Хвалілі: казалі, што п'ецца добра, па мазгах не б'е... Хіба што ногі потым заплятаюцца. Будзеце браць?

— Не. Ногі ў мяне і так заплятаюцца. Мне б для галавы што-небудзь...

Процьма бутэлек. Нялёгкі выбар. Не ўсякаму «па зубах», як і той арэшак.

## ТОЕ НА ТОЕ

Вёска. Вясна. Свята — і такое ж рэдкае! Чалавек нарадзіўся — хлопчык, можна сказаць, асілак (амаль чатыры кіло)!

Бацька з той радасці і сам выпіваў, і людзей частаваў: шчодра, як здавалася, але ж чацвёра яго сябрукоў «на дасягнутым» не спыніліся: купілі нейкай атруты, дабавілі яшчэ.

Сумная арыфметыка: двое з іх працнуліся дома, адзін — у бальніцы (ледзьве адкачалі), а яшчэ аднаго знайшлі на вуліцы — нежывым.

У выніку ў вёсцы тое на тое: адзін чалавек нарадзіўся, адзін памёр.

## ДРУГІ БОК МЕДАЛЯ

Новы год, новыя суседзі, а з імі — новыя... пахі. І не толькі парфумы: на лесвіцу амаль штовечар «выплывае» водар смажанага мяса, пірагоў, вострай салянкі, капусты... Гатуе нехта, стараецца, што для сямейнікаў, напэўна ж, добра?

Днямі тыя сямейнікі ўпершыню без куртак ды плашчоў на вуліцу выйшлі — вынеслі, так бы мовіць, свае жываты, свае лішнія кілаграмы.

...Знаёмы мастак казаў: калі ты нядаеў — ты пад'еў, калі ты пад'еў — ты пераеў, а калі пераеў — атруціўся.

Са смачнай ежай гэта, відаць, найлягчэй.

## ПРАБЛЕМЫ ЗРОКУ

Праверана: мужчыны, уступіўшы ў так званы грамадзянскі шлюб, па-ранейшаму лічаць сябе свабоднымі, жанчыны — замужнімі. Ліза, напрыклад, са сваім маладым чалавекам шэсць гадоў пражыла, верыла, ведала і ўсім гаварыла, што гэта ўжо назаўсёды. А вось ён...

Ён — замест прапановы рукі і сэрца — зусім іншую зрабіў: сказаў, што ім трэба расстацца, бо яны — не пара. Ён, прынамсі, высокі, а яна — малая...

Каб «разгледзець» гэта, хлопцу спатрэбілася ажно шэсць гадоў.

## З ПРЫВІТАННЕМ?

З вандровак па іншых гарадах некалі модна было прывозіць наборы паштовак, адмысловыя кнігі-буклеты, потым — карцінкі-магнікі. А што — зручна: дома на халадзільнік «прыклеіў» і ўсё: на вачах Ісакіеўскі сабор з Піцера, найстаражытнейшае аліўкавае дрэва з Грэцыі, Карлаў мост з Прагі, певень з Партугаліі, праменад з Ніцы... Гэта нам — на ўспамін.

Што ад нас?

У Мінску ў адным з сувенірных кіёскаў кінуўся ў вочы магнік з надпісам: «Прывітанне з краіны бульбашоў!»

Не ведаю, як вам, а мне цікава было б паглядзець, напрыклад, на ўкраінца, які наладзіў бы вытворчасць, а потым і продаж вось такіх магнікаў-прывітанняў — «з краіны (прабачце!) хахлоў». Альбо на рускага... «з краіны кацапаў».

## ПРЫКЛАД

Дзень, горад, шумнае скрыжаванне. Пад святлафорам (апроч тройкі пешаходаў) — сабака: пастаяў, пачакаў, пакуль яму загарыцца зялёнае святло, жвава перабег на другі бок вуліцы.

Бяздомнік, бач, але гарадскі — ведае правілы.

У адрозненне ад людзей.

## БУМЕРАНГ

Тады пра нейкае там планаванне сям'і ніхто не гаварыў. Згулялі маладыя вяселле, значыць праз год (а то і раней) можна збірацца на хрэсьбіны: адны, потым другія, трэція...

У гэтай пары дзяцей не было — ні праз год, ні праз тры, ні праз пяць.

А яны ж чакалі, хацелі! Маладзіца (у той час лічылася, што загана толькі ў жанчынах) абышла ўсіх дактароў ды шаптух, аб'ездзіла шмат курортаў...

І такі ж дамагласа свайго: зацяжарыла, данасіла, на сёмым годзе сямейнага жыцця нарадзіла хлопчыка. На дзіва ўдалага: у тры гадкі ён ужо літары ведаў, у чатыры — чытаў. І ўсё прасіў у бацькоў, каб яму сястрычку купілі.

А тыя б і рады! Бацька — з усіх дарог і на ўсякі выпадак — лялек дадому звозіў, маці — (на ўсё ж дэфіцыт быў) прыгожыя сукеначкі ў шафу складала, чаравічкі купляла, стужачкі ў косы.

Заплятаць не мела каму, бо яшчэ раз зацяжараўшы, нарадзіла... яшчэ аднаго сынка.

Тры дні потым (сама расказвала) плакала, тры дні зусім не жартам хадзіла за дакторкай, упрошвала, каб памяняла яна гэтага харошага хлопчыка на любую дзяўчынку: ну быць жа не можа, каб ніхто не хацеў!

Але ж не ўгаварыла: не ўзяла тая грэх на душу, выпісала іх з сынам.

Бацькі абодвух сталі гадаваць. Абодвум вышэйшую адукацыю далі, вяселлі справілі, з жыллём дапамаглі, але...

Першым, старэйшым сынам усё жыццё нахваліцца не маглі: чалавекам стаў ва ўсіх адносінах! Кар'еру зрабіў, сям'ю стварыў, дзяцей гадуе, пра бацькоў клапоціцца.

А вось з малодшым змалку праблемы былі: наракала маці, што непаслухмяны, што гультаяваты, што не вучыцца, не дапамагае, што выпівае, жэніцца-разводзіцца, што нейкі ён зусім чужы ім, асабліва ў старасці...

Як яны яму? У маленстве.

## ШТО ДА ЧАГО

«Каб пераканацца, што госць пайшоў, трэба спусціць яго з лесвіцы».

Мусіць, помнячы гэтае правіла, Міхайлаўна ўскідвае на плечы куртку, насоўвае чаравікі — збіраецца праводзіць.

— Гэта ты, каб госці хутчэй сышлі? — пытаецца малая ўнучка. — І да нас не вярнуліся?

Магчыма.

## ЖАНЧЫНЫ

Пятніца. Электрычка.

— У вас свабодна? — пытаецца нейкая жанчына і садзіцца насупраць.

Следам і з тым жа пытаннем прыходзіць другая — відавочна незнаёмая, але ж...

— Вы сваю кофту самі вязалі? — пытае ў суседкі.

— Ну...

— І ў мяне такія ніткі ёсць, толькі іншага колеру. Якія бралі пруткі?

...Электрычка ехала далей. «Вязальшчыцы» гаманілі — як блізкія прыяцелькі.

Бо жанчыны, бо ў іх адно, як мінімум, агульнае захапленне.

## КУКАВАЛА ЗЯЗЮЛЯ...

Вёска. Грады. Зязюля з першым «куку». І зноў знянацку: пры сабе — ні капейкі! Амаль як у таго дзядзькі...

Ён, казалі, свята ў прыкметы верыў і таму, каб буйныя грошы вадзіліся, напрадвесні па ўсіх кішэнях — што ў портках, кашулях, жакетках — дробныя раскладаў. Хваліўся, што ўжо сёлета знячэўку зязюля яго не заспее, бо што б ні надзеў...

І сапраўды: цямком яшчэ з ложка падняўся, босы-голы амаль на ганак выйшаў, а там — ку-ку...

Падманула зязюля не нас адных.

## АД УСМЕШКІ...

Сталіца, праспект, тратуар. Некалі знаўцы беларускай даводзілі, што слова гэта — калькаванае з рускай, што па-нашаму месца, дзе ходзяць, трэба называць ходнікам.

Пакуль спрачаліся, шмат што змянілася: тратуары, у прыватнасці, падзялілі на «зоны» — асобна для тых, хто ходзіць, і асобна для тых, хто ездзіць — на роварах. Іх нямала ўжо; носяцца, як чэрці, а таму «дарожкі» лепей не блытаць.

Мы ідзём па сваёй — смела і нават са смехам, бо наперадзе нейкі начальнік — у дыхтоўным касцюме, высокі, шыракаплечы, з пышнай шавялюрай, з дарагім партфелем. І з... белымі паперкамі на падэшвах. Можа, туфлі прадаваліся так, можа, ён (ці нехта?) забіраў з рамонту і забыўся зняць?

...Можна было б нагадаць. Але тады на праспекце стане менш усмешак, ад якіх і насамрэч часам святлее. Нават пахмурны дзень.

**Валянціна ДОЎНАР.**
dounar@zviazda.by

■ Неасабісты суб'ектыў

# АПОШНЯЕ ЛЕТА ДЗЯЦІНСТВА



### Калі ёсць мазгі, але няма тармазоў

У Наваполацку тры пяцікласніцы затрымалі злодзея-рэцыдывіста. Дзяўчаткі гулялі на спартыўнай пляцоўцы, паклаўшы свае рэчы на зямлі побач з ёй. Ахвотнік да чужога дабра схапіў адтуль два мабільнікі і кінуўся наўцёкі. Дзяўчаты не разгубіліся і панесліся яго даганяць, адна нават схапіла яго за руку. Злодзей ад нечаканасці кінуў скрадзенае і паспрабаваў схавацца ў пад'ездзе. Але пакрыўджаныя дзеці не супакоіліся, кінуліся да машыны, якая праязджала міма, папрасілі кіроўцу выклікаць міліцыю. Пасля працягнулі сачыць за крыўдзіцелем, які выскачыў з пад'езда, і, калі прыехала міліцэйская машына, вельмі хутка на злачынцу, які спрабаваў змяшацца з натоўпам на прыпынку, праваахоўнікам паказалі...

Злодзей аказаўся восем разоў судзімы за крадзеж. Дзяўчаты праславіліся калі не на ўсю краіну, дык у сваёй школе дакладна — ім на ўрачыстай лінейцы аб'явілі падзяку ад міліцыі і Следчага камітэта. Карацей, малайцы, і ўсё тут...

Не ведаю, як вам, а мне гэта гісторыя падалася не такой адназначнай. Добра, што ўсё скончылася добра. А калі б у злодзея аказаўся нож? А калі б ён (нагадаю, гэты чалавек адседзеў восем тэрмінаў зняволення) проста схапіў адзінаццацігадовую гераіню і стукнуў галавой аб сцяну? Пра што б мы пісалі тады? У якім ключы падавалі б трагічную інфармацыю? І, пэўна, мае рацыю той карыстальнік сеціва, які ў каментарыі да гэтай навіны напісаў штосьці кшталту: да ўзнагарод ім трэба дадаць добрага прачуханца ад бацькоў, каб больш не лезлі на ражон.

Можна, вядома, яшчэ гаварыць пра тое, што мы выхоўваем сваіх дзяцей выключна як спажыўцоў: маўляў, тэлефоны ім даражэйшыя за жыццё. Але тут, я думаю, іншае. Успомніце сябе ў адзінаццаць — трынаццаць гадоў. Вы б не спакусіліся магчымасцю затрымаць бандыта — якраз як дэтэктыў у кіно або ў кнізе? Небяспека? Якая небяспека? Герой заўсёды выжывае і перамагае — хіба можа быць інакш?

І вось тут, здаецца, трэба гаварыць менавіта аб выхаванні. Шмат разважаем і пішам пра бяспеку дзяцей — але якіх дзяцей? Правільна, зусім малых, гадоў гэтак да сямі. З году ў год паўтараем самі сабе і іншым: малых нельга пакідаць адных ні на хвіліну. Яны могуць праглынуць батарэйку ці таблеткі, упасці ў ёмістасць з вадой ці нават у лужыну і там захлынуцца, залезці на падаконнік і выпасці з акна... А вось калі дзіця дасягае ўзросту, калі не цягне ў рот усё, што трапіцца, трохі навучылася плаваць у басейне і ведае, што такое страх вышыні, мы пачынаем больш клапаціцца пра добрыя адзнакі ў школе ды пра тое, каб нашчадак не трапіў пад уплыў дрэннай кампаніі. Правілы асцярожнасці і элементарнага выжывання застаюцца па-за ўвагай. Навошта — дзіця ж ужо амаль дарослае.

Уся бяда ў тым, што падлеткі лічаць гэтак жа, толькі без слова «амаль». А гэта, памножанае на авантурызм, які ў падлеткавым узросце ўласцівы ўсім, нават самым спешчаным матуліным сыночкам і дачушкам, дае нярэдка горкі, а то і трагічны вынік. Зрэшты, так было заўсёды — упэўнена, кожны першы дарослы самавіты дзядзька ці гэткая самая цётка прыгадае, як гадоў у дванаццаць былі на валаску ад гібелі ці калецтва. (Ваша пакорная слуга, напрыклад, двойчы тапілася, трапіўшы ў вір, стрымгалоў ляцела ў крапіву з самаробнай канатнай дарогі, працягнутай над старым кар'ерам паміж двума дрэвамі на вышыні метраў дзесяць, і ледзь не задыхнулася пад сенам: мы гурмой тапталі яго на вышках — як дарослыя — і мае хаўрусніку не заўважылі, што пад чарговай порцыяй, кінутай нам для ўкладвання, апынулася я.)

У гэтым узросце ўжо ёсць мазгі, але няма тармазоў — вось у чым праблема. А яшчэ дадайце да гэтага найноўшы штрых — камп'ютарныя гульні — прыгоды ды баевікі, у якія так любяць гуляць менавіта падлеткі. У іх герой, з якім яны сябе атаясамліваюць, — бессмяротны, у яго не дзевяць — дзевяноста дзевяць жыццяў, яго забіваюць, а ён уваскрасае і працягвае ратаваць свет. Нездарма псіхолагі б'юць трывогу: у нашых дзяцей знізіўся парог страху і інстынкт самазахавання. Жыццё для іх — гульня, якую можна пачаць спачатку, калі нешта пойдзе не так. Адарваныя ад рэальнага жыцця, не бачыўшы ніколі чалавечых пакут і смерці (не на экране, а насамрэч), лічачы, што яны ўжо дарослыя, што ўсё ведаюць і ўмеюць, яны пачынаюць «шукаць скарбы» ў закінутых кар'ерах, ладзіць скачкі па дахах, эксперыментаваць з хімічнымі рэчывамі, самастойна высочваць і лавіць злачынцаў або тушыць пажар. На жаль, вельмі рэдка падобныя прыгоды заканчваюцца падзякай і славай калі не на ўсю краіну, дык на ўсю школу дакладна.

Вось зводка здарэнняў толькі за апошнія сем дзён. У Бярэзінскім раёне, сарваўшыся з самаробнай «тарзанкі», утапіўся 13-гадовы хлопчык. «Атракцыён» мацаваўся на дрэве на беразе Бярэзіны, падлетак не ўтрымаўся на вяроўцы і паляцеў у ваду. Рака там хуткая і глыбокая. Цела хлопца знайшлі толькі назаўтра. А ў Бабруйску пяцікласнік рашыў пачысціць бацькоўскі гараж, спаліўшы смецце проста на месцы. Каб добра ўгарэлася, плюхнуў туды бензіну (як дарослы!). Цяпер з сур'ёзнымі апёкамі ў бальніцы. У Барысаўскім раёне 13-гадовы веласіпедыст спрабаваў праскочыць перад красоверам. Дзякуй богу, застаўся жывы, але атрымаў траўмы...

...НЯДАЎНА адна знаёмая настаўніца прызналася: «Ведаеш, што я найбольш люблю першага верасня? Назірацьдзь, як за лета змяніліся шасці-сямікласнікі. Сыходзілі ў маі дзеці-дзецьмі, а вярнуліся — юнакі і дзяўчаты. А ведаеш, чаго найбольш баюся? Што кагосьці з іх на той першай лінейцы я не далічуся...»

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** alena@zviazda.by

## 5 июля 2017 года в 10.00 в малом зале Гомельского районного исполнительного комитета, расположенного по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 51а, состоится аукцион по продаже земельных участков в частную собственность для коллективного садоводства

| Номер лота | Наименование объекта | Место, дата, время начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов | Кадастровый номер и адрес земельного участка, его размеры, целевое назначение, характеристика инженерных коммуникаций | Вещное право на земельный участок | Начальная цена предмета аукциона | Расходы по организации и проведению аукциона, подлежащие возмещению победителем аукциона | Размер задатка, срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета | Организация, которая предоставляет информацию о месте размещения земельных участков, которые предполагается передать в аренду по результатам аукциона | Адрес и номер контактного телефона комиссии или организации |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 1 | Для коллективного садоводства (земельный участок для коллективного садоводства) | г. Гомель, ул. Ильича, 51а, каб. 111. Дата и время начала и окончания приема заявлений: с 04.03.2017 по 31.03.2017 с 8.30 до 13.00 с 14.00 до 17.30 | 321084800019000051, площадь 0,1363 га Гомельская обл., Гомельский район, в районе д. Плесы Поколюбичского сельсовета, садоводческое товарищество «Жемчужная поляна», участок №15. Земельный участок имеет ограничения (обременения) в использовании на площади: 0,1363 га в связи с его расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона реки Сож). Имеется возможность подключения электроснабжения | Частная собственность | 8 946, 87 рубля | 917,77 рубля + расходы, связанные с опубликованием объявления | 900 рублей на р/с Гомельского райисполкома 3641414000270, филиала №302 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 151501664, УНП 400178549 | Землеустроительная служба Гомельского районного исполнительного комитета г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, кабинет 111 тел. 8 0232 36-03-21 | г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а 36 03-21 |
| 2 | Для коллективного садоводства (земельный участок для коллективного садоводства) | г. Гомель, ул. Ильича, 51а, каб. 111. Дата и время начала и окончания приема заявлений: с 04.03.2017 по 31.03.2017 с 8.30 до 13.00 с 14.00 до 17.30 | 321084800019000054, площадь 0,1261 га Гомельская обл., Гомельский район, в районе д. Плесы Поколюбичского сельсовета, садоводческое товарищество «Жемчужная поляна», участок №14. Земельный участок имеет ограничения (обременения) в использовании на площади: 0,1261 га в связи с его расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона реки Сож). Имеется возможность подключения электроснабжения | Частная собственность | 8 277,33 рубля | 1 019,77 рубля + расходы, связанные с опубликованием объявления | 830 рублей на р/с Гомельского райисполкома 3641414000270, филиала №302 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 151501664, УНП 400178549 | Землеустроительная служба Гомельского районного исполнительного комитета г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, кабинет 111 тел. 8 0232 36 03-21 | г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а 36 03-21 |
| 3 | Для коллективного садоводства (земельный участок для коллективного садоводства) | г. Гомель, ул. Ильича, 51а, каб. 111. Дата и время начала и окончания приема заявлений: с 04.03.2017 по 31.03.2017 с 8.30 до 13.00 с 14.00 до 17.30 | 321084800019000055, площадь 0,1243 га Гомельская обл., Гомельский район, в районе д. Плесы Поколюбичского сельсовета, садоводческое товарищество «Жемчужная поляна», участок №16. Земельный участок имеет ограничения (обременения) в использовании на площади: 0,1243 га в связи с его расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона реки Сож). Имеется возможность подключения электроснабжения | Частная собственность | 8 159,18 рубля | 873,74 рубля + расходы, связанные с опубликованием объявления | 815 рублей на р/с Гомельского райисполкома 3641414000270, филиала №302 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 151501664, УНП 400178549 | Землеустроительная служба Гомельского районного исполнительного комитета г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, кабинет 111 тел. 8 0232 36 03-21 | г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а 36 03-21 |

Условия участия в аукционе.

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, представляет документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключает с местным исполнительным комитетом или по его поручению с организацией соглашение установленной формы.

Кроме того, в комиссию или организацию представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию или организацию в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении о проведении аукциона, а также заключившие соглашение.

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из предметов аукциона.

После получения необходимых документов от гражданина, индивидуального предпринимателя и юридического лица на участие в аукционе комиссия или организация выдает ему билет участника аукциона с указанием даты регистрации заявления и номера, под которым он будет участвовать в аукционе. Данные о каждом участнике аукциона заносятся в книгу регистрации участников аукциона.

Участник аукциона имеет право до начала аукциона письменно отозвать заявление об участии в нем. Неявка участника аукциона на аукцион приравнивается к письменному отзыву заявления об участии в нем. При этом участнику аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона возвращается сумма внесенного им задатка (задатков).

Письменный отзыв заявления или неявка участника аукциона на аукцион регистрируется в книге регистрации участников аукциона.

Прием заявлений об участии в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленный комиссией или организацией день и час, но не ранее чем за 3 рабочих дня до даты проведения аукциона. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в комиссии или организации.

Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

Перед началом аукциона его участники обязаны зарегистрироваться в комиссии или организации и обменять билеты участников аукциона на аукционные номера, которые возвращаются в комиссию или организацию после окончания аукциона.

Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

1. в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся:

1.1. внести плату за земельный участок или плату за право заключения договора аренды земельного участка;

1.2. возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам документов, необходимых для его проведения, формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка;

2. в течение двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона обеспечить осуществление государственной регистрации земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него;

3. в течение одного года со дня государственной регистрации возникновения права на земельный участок приступить к занятию земельного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления;

4. по мере изменения фактического состояния и характера использования земель обратиться в райисполком для внесения сведений в государственный земельный кадастр сведений об изменении видов земель.

Аукцион проводится при наличии двух или более участников аукциона.

Участникам предоставляется возможность осмотра земельного участка на местности с представителем комиссии по организации и проведению аукционов по продаже земельных участков в частную собственность и на право заключения договоров аренды земельных участков.

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

**извещает о повторном открытом аукционе (цена снижена) по продаже машино-места, г. Минск, ул. В. Хоружей, 48А-51**

| | Начальная цена продажи, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|
| Лот №1. Изолированное помещение с инв. №500/D-708047541. Машино-место №51. Г.п. – 2012. Этаж – подвал. Общая площадь – 14,6 кв. м | 12 441,60 | 1 240,00 |

УСЛОВИЯ

